Стоит ли говорить о том, что даже слабый пол был силён как никогда? Прадедушка при описании обороны Кривого Рога рассказывал о девятнадцатилетнем санинструкторе Маше Бережной, которая после получения ранения могла эвакуироваться, но осталась перевязывать тяжелораненых, и так с бинтами в руках она разделила смертную участь до конца не дрогнувших перед смертельной опасностью бойцов. Сохранение жизни раненных они ценили больше своей жизни.

Военным приходилось принимать не то что непростые решения, а наитяжелейшие. Так, например, командир полка Д. В. Татарников принял одно из них: когда в течение дня 9-ая рота отбила 7 атак и когда живых осталось всего 3 тяжелораненых бойцов, сержант Павел Тезиков, передавая предсмертную просьбу защитников высоты, вызвал огонь нашей артиллерии на себя.

Нелегко командиру полка далось решение ударить огнем артиллерии по своим, даже выполняя их предсмертную просьбу…

Я понимаю, что во время воны таких случаев было очень много, но это еще раз доказывает, что тогда люди могли правильно расставлять приоритеты, и чаще всего, в огромный ущерб себе!

Война пощадила прадедушку. Ему одному из немногих врачей войскового звена, прошедших по полям сражений всю войну, повезло остаться в живых.

**А. Голас**

## ВІЗУАЛЬНАЯ ПРАПАГАНДА ТРЭЦЯГА РЭЙХА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Пад час Другой Сусветнай вайны нацысцкае кіраўніцтва выкарстоўвала розныя сродкі, каб прыцягнуць людзей да сваёй ідэалогіі, і адным з такіх сродкаў была прапаганда. Гісторыя гэтай з’явы пачалася ў 1920 г., калі Гітлер быў назначаны адказным за прапаганду ў нямецкай працоўнай партыі, якая пасля стала нацысцкай. Хоць мы і ведаем, што ён меў вялікі талент у аратарскім майстэрстве, але адзін ён не змог бы паўплываць на розумы тысячаў людзей. Таму на дапамогу яму прыйшоў Паўль Ёзэф Гебельс - міністр прапаганды і правая рука Гітлера.

Гебельс запусціў выраб таннага радыё (Volksemfpänger), каб кожная сям’я змагла набыць уласны прыёмнік. Па радыё перадавалі не толькі прамовы Гітлера, а яшчэ ўстаўлялі выступленні вядомых спявачак і іншыя формы пацяшальнага мастацтва. І вось менавіта гэтая сумесь выклікала патрабаваны эфект. Другім шляхам нацысцкай прапаганды было кіно. Гебельс, натхнённы ідыялагічнымі камуністычнымі стужкамі, разумеў, што кіно, якое ў той час набірала моц, можа вельмі дапамагчы ў прапагандскіх мэтах. Насельніцтву паказывалі фільмы розных жанраў: драмы, камедыі і пацяшальныя фільмы, і ў кожным заклалі нацысцкія ідэі і думкі, такім чынам

уплываючы на людзей з усіх бакоў. Грамадзян пачыналі «апрацоўваць» ужо з дзяцінства: была створана арганізацыя «Гітлерюгенд»; адчынялі нацыянал-палітычныя вучэбныя ўстановы для падрыхтоўкі будучых нацысцкіх кіраўнікоў. У ліцэях Германіі, напрыклад, быў уведзены такі прадмет як расавае вучэнне, пад час якога пры дапамозе шматлікіх вымяральных прылад настаўнік рабіў замеры частак цела і твару для падцвержання арыйскага паходжання. І канешне вялікі прапагандскі ўплыў мелі прамовы фюрэра і Гебельса. Міністар прапаганды заўсёды вельмі доўга рыхтаваўся перад выхадам да людзей. Ён рэпеціраваў пэўныя часткі сваёй прамовы і некаторыя рухі. У зале, дзе адбывалася само дзеянне, сядзелі партыйныя дзеячы, якія павінны былі апладзіраваць у пэўных месцах, і былі запрошаны акцёры, якія рабілі спантаныя станоўчыя рухі.

І прапагандская дзейнасць не абмяжоўвалася толькі тэрыторыяй Германіі. На акупаваных тэрыторыях, менавіта, на тэрыторыі Беларусі, яна мела свае пэўныя формы. Каб падмацаваць давер насельніцтва да нямецкага кіравання, быў створаны Саюз беларускай моладзі, у які прымалі нават тых маладых людзей, якія мелі праблемы з выхаваннем ці якія з'яўляліся злачыннымі элементамі грамадства. Мясцовыя прапагандысты (так званыя пераадукаваныя былыя палонныя) распаўсюджвалі заклік да супрацоўніцтва праз газеты, малюнкі, але самым зручным сродкам былі плакаты. Каб пашырыць эфект праганды надпісы на іх рабіліся на беларускай мове і акцэнт пераносілі на балючыя пункты для савецкага чалавека – Сталін ці бальшавісцкая ўлада. Таксама выкарыстоўвалі вобразы нацыянальных герояў і людзей у традыцыйным адзенні. Забаранялася слухаць маскоўскую лінію і асабіста радыёхвалю BBC, дазволена была толькі нямецкая.

**А. Голубева**

## НЕПРЫСТУПНАЯ ЦВЯРДЫНЯ НА ДНЯПРЫ

Больш за тры чвэрці стагоддзя прайшло з абарончых баёў пад Магілёвам летам 1941 года, якія далі істотны штуршок для пачатку зрыву «маланкавай вайны» германскага Вермахта. 15 ліпеня быў аддадзены загад Вярхоўнага Глаўнакамандуючага з такімі словамі: «Магілёў зрабіць непрыступнай крэпасцю».

Існуе традыцыйная канцэпцыя абароны Магілёва, замацаваная на аснове ацэнак намесніка камандуючага Заходнім фронтам генерал-лейтэнанта А. І. Яроменкі. У сваіх пасляваенных успамінах ен пісаў пра тры этапы гераічнай абароны цвярдыні на Дняпры. Першы этап – адыходзячыя часці 13-й арміі і 61-а стралковага корпуса вялі на далёкіх і бліжніх подступах да горада напружаныя баі з перадавымі часцямі вермахта. Разведвальным групам была пастаўлена задача абараняць дняпроўскі рубеж: яны у 20–25 км наперадзе асноўнай лініі абароны сустракалі праціўніка і прымушалі яго разгортвацца ў баявы парадак, замаруджваючы прасоўванне гітлераўцаў на